Шырока разгортваючы сьмелую пралетарскую самакрытыку, партыя мабілізуе масы барацьбу з тэорыяй і практыкай апартунізму, за правядзеньне Ленінскай лініі.

Не дапусьціць зрыву партвучобы

Калі мы ў гэтым годзе маем значнае палепшаньне ў нашай партвучобе ў галіне сыстэмы, дык гэтага ня маем у галіне плянавасьці. Першы месяц нашых заняткаў паказаў шмат недахопаў, якія патрэбна безадкладна зьнішчыць.

Факт першы: прыходзіць дзень партвучобы і ні водзін гурток ня ведае, дзе ён павінен займацца, дзе павінны зьбірацца сябры гуртка. Калі і знойдзеш аўдыторыю, дык прыходзіцца шмат спрачацца, і пераможцам застаецца той, хто дужэй. Адсутнасьць сталага памяшканьня часта зрывае дзень партвучобы.

АПА Каляктыву КП(б)Б, ведаючы колькі ўсяго працуе гурткоў і колькі маецца памяшканьня, патрэбна зрабіць календарны расклад працы гурткоў усяго Унівэрсытэту. Гэта дасьць магчымасьць абыйсьціся бяз зрыву заняткаў.

У галіне забесьпячэньня гурткоў літаратурай справа абстаіць таксама няважна. Цяпер ідзе распрацоўка апошняга Лістападаўскага Пленуму ЦК УсеКП(б), а літаратуры ў габінэце Марксызму і Ленінізму не хапае. Не хапае літаратуры і па другіх пытаньнях.

Патрэбна сваечасова і ў дастатковай меры забясьпечыць гурткі неабходнай літаратурай.

Наглядаецца слабае наведваньне гурткоў, нізкі ўзровень падрыхтоўкі да заняткаў. Усё гэта ставіць пад пагрозу нашу партыйна-камсамольскую вучобу. Патрэбна штодзённая праверка з боку АПА Каляктыву КП(б)Б і апоргаў ячэяк, каб сваечасова рэагаваць на ўсе недахопы.

К. Самахвалаў.

Акадэмпрацу ў асяродак увагі камсамолу.

Дабіцца лепшай арганізаванасьці і большай эфэктыўнасьці ў працы.

На долю Ленінскага камсамолу выпала новая досыць складаная і ня ў меншай ступені адказная задача—дапамагчы партыі практычна разьвязаць у мінімальны тэрмін праблему кадраў.

Камсамол ня быў-бы камсамолам, калі-б ён аказаўся ня здольным у сваёй практычнай дзейнасьці рэалізаваць задачы, якія высоўваюцца партыяй.

На фабрыках і заводах камсамольскія арганізацыі цалкам урасьлі ў вытворчасьць. Праз ударныя вытворчыя брыгады, сацыялістычнае спаборніцтва разам з усёй рабочай клясай, яны актыўна ўдзельнічаюць у падняцьці вытворчасьці працы, зьніжэньні сабекошту прадукцыі, узняцьці працоўнае дысцыпліны і інш.

Бюро Каляктыву ЛКСМБ на сваім апошнім пасяджэньні знайшло, „што сыстэма работы камсамольскай арганізацыі БДУ і яе адносіны да ўдзелу ў акадэмпрацы павінны быць карэнным чынам перабудаваны, павінны пайсьці па лініі: тварам да вытворчасьці, тварам да вучобы“, і што „вытворчыя пытаньні яшчэ цалкам ня сталі ў асяродак усёй сыстэмы работы камсамольскай арганізацыі“.

Вялікая ўвага спынена на пытаньні павялічэньня ўдзельнай вагі курсавых арганізацый: „патрэбна зрабіць іх—як гаворыцца ў пастанове—да канца самастойнымі і рухавымі адзінкамі ў сыстэме арганізацыйнай пабудовы камсамольскай арганізацыі“.

Завострана пытаньне аб правядзеньні рацыяналізацыі пазавузаўскай і ўнутры вузаўскай работы.

Вось факты „рацыянальнасьці“: на Абутковай фабрыцы няпісьменнасьць і малапісьменнасьць 53-х чалавек ліквідуюць 45 студэнтаў; на Хлебазаводзе з 24-мя рабочымі працуюць 24 студэнты; на заводзе „Бальшавік“ з 175-ю рабочымі займаецца звыш 65-і студэнтаў.

Трэба зараз-жа прарабіць належную працу па рацыяналізацыі грамадзкае работы. Гэта вызваліць вялікую колькасьць студэнцтва, якую можна будзе скарыстаць на іншых галінах работы і разгрузіць перагружаных таварышоў.

Мы надзвычайна распылілі свае сілы, губляем шмат часу зусім дарэмна. Сыстэму нашай грамадзкай працы трэба пераглядзець і перабудаваць.

Камсамол павінен на гэтым вучастку паказаць лепшыя ўзоры сваёй плённай працы.

Р. Касьцюковіч.

„Фармальны“ антысэмітызм.

(Яч. КП(б)Б Пэдфаку).

За час чысткі ячэйкі КП(б)Б Пэдфаку высьветлены цэлы шэраг недахопаў як у працы ячэйкі, так і паасобных яе сяброў. Былі моманты, калі склад мінулагодняга Бюро ячэйкі, адказным сакратаром якога зьяўляўся тав. Марока ня рэагаваў на варожыя нам праявы.

Студэнт 3-га курсу Літ.-лінгв. аддзяленьня Катановіч каб навесьці ў пакоі студэнцкага інтэрнату чыстату і парадак зварачаўся да свайго таварыша яўрэя: „Кінь ды жыдоўскую, гандлярскую прывычку пачкаць падлогу“. У пакоіку, дзе жыў Катановіч, былі асобныя куткі „беларускі“, у межах якога стаялі ложкі студэнтаў-беларусоў і куток „яўрэйскі“ — студэнтаў па нацыянальнасьці яўрэяў.

Пры індывідуальнай праверцы кандыдат КП(б)Б Катановіч сказаў, што гэта не антысэмітызм, таму што яны ніколі з таварышамі „в душе не питали“ гэтага, а вышла „формально“.

На гэты яўны факт антысэмітызму ня была зьвернута думка грамадзкасьці, як на варожую нам праяву.

Бюро ячэйкі КП(б)Б нават зусім не разглядала гэтага пытаньня.

Ю. Е.

Не дэкларацыяй, а справай.

Студэнцтва і навуковыя працаўнікі не даацэньваюць антырэлігійнай барацьбы.

Антырэлігійная праца ў БДУ—справа новая. Да 1929 г. ніякай антырэлігійнай працы не вялося.

Вясною гэтага году былі арганізаваны ячэйкі Саюзу Ваяўнічых Бязбожнікаў пры Рабфаку, Пэдфаку і Правгасу.

Калі ў час арганізацыі ячэйкі СВВ Пэдфаку былі чутны выклікі: „Навошта ў нас весьці антырэлігійную працу, мы ня веруем, людзі адукаваныя“, дык цяпер наглядаецца вялікая зацікаўленасьць антырэлігійнай прапагандай.

Нашы бязбожнікі працуюць на заводах, у падшэфных вайсковых частках, сельсаветах. Дзеля лепшай падрыхтоўкі—4 студэнты былі накіраваны ў антырэлігійны Унівэрсытэт.

Ячэйка СВБ Правгасу толькі ў апошні месяц аформілася. Былі выпадкі, калі партыйцы і камсамольцы адмаўляліся ўступаць у Саюз Ваяўнічых Бязбожнікаў.

Ячэйка СВБ Масцкому БДУ была арганізавана з вялікай помпай. Былі напісаны і пасланы рэвалюцыйныя дэкляряцыі ў ЦК КП (б) Б, ЦК УсеКП(б), былі прыняты шырокія праэкты, пляны і г. д.

Але на гэтым і застанавілася. Цяпер ячэйка амаль што развалена.

Мэдфак-жа лічыць ніжэй сваёй годнасьці займацца антырэлігійнай працай.

Да гэтага часу і партыйная арганізацыя слаба кіравала антырэлігійнай працай БДУ.

Пекер

Тов. Крускоп рашуча „наступ

Якая галоўная задача партыі ў барацьбе з кулаком на вёсцы? — пытае старшыня праверкамісіі.

„Рашуча наступаць, вырываючы яго карэньне“, — адказвае тав. Крускоп.

Але гэта ў яго тэорыі. Паглядзім, як-жа ён наступае на кулака на практыцы.

Кожны год у час летніх вакацый ён едзе да бацькі — кулака, які абкладваецца індывідуальным падаткам. Ён едзе на дачу, як зазначаюць яго таварышы.

З выказваньняў у час праверкі т. Крускопа выявілася, што бацька яго раней меў 3-х чалавек наёмных рабочых.

Ці ведаў пра гэта тав. Крускоп?

Бязумоўна, ведаў, калі быў кожнае лета ў бацькі.

У анкеце, пры паступленьні ў БДУ, ён захаваў маемасьць бацькі — кулака.

Я з бацкам ня жыву, быў адказ Крускопа, — я нават за харчы яму плаціў.

І на гэтай падставе т. Крускоп патрабуе сабе стыпэндыі.

Але-ж можа т. Крускоп усьвядоміў сваю памылку, паведаміў пра гэта Бюро ячэйкі, па-
раіўся, як яму выблыт
путаў бацькі—кулака, ку
цягнуў яго нейкі не
ўнутраны дух?

Так, тав. Крускоп пр
ся, раскрыў сваё нутро.
хаду, спаткаўшы сэкратар
кі, кажа:

— Скажы, як мне быць,
браток. Мой бацька абк
індывідуальна і г. д.

Але-ж калі зьявілася
шчырае прызнаньне? За
перад тым, калі ён павіне
праходзіць чыстку.

Раней ён пра гэта ані
Якім-жа працаўніком б
варыш Крускоп на вёс
Будучы інспэктарам у 3
скім раёне, ён быў начал
які заціскаў сваіх паднача

Калі ліквідавалі Зембін
ён, ён прымае актыўны ў
банкеце разам з іншымі
цілами“ Зембінскага гнойн

Але-ж гэта было раней
цяпер таварыш Круск
сім справіўся — запытаецц

Словы аднаго з пра
адкажуць вам і на гэта:
тыйнага твару таварыш
коп ня меў раней, ня м
і цяпер.

Нацыянал-дэмакратам ня ме ў БДУ.

„Прызнаючы на даным этапе разьвіцьця галоўнай небясьпекай правы ўхіл і нацыянал-дэмакратызм, якія імкнуцца аформіць ідэалёгію кулака і нэпмана, пралетарскае студэнцтва пад кіраўніцтвам Камуністычнае Партыі і вядзе і будзе весьці рашучую барацьбу з рознымі праявамі варожай нам ідэалёгіі, якая накіравана супроць дыктатуры пралетарыяту. Пралетарскае студэнцтва ня можа дапусьціць у сваіх шэрагах палітычна-варожых і ідэалёгічна-чужых элемэнтаў, яно будзе рашуча змагацца за чыстату марксыцка-ленінскай ідэалёгіі“.

Так заявілі студэнты 4-га курсу Сацыяльна-Гістарычнага Аддзяленьня Пэдфаку ў сваёй рэзалюцыі па выключэньні з БДУ Ляшэвіча.

Савецкай грамадзкасьці ўжо вядома нацыянал-дэмакратычная вылазка Ляшэвіча на зьезьдзе работнікаў друку, дзе Ляшэвіч пад „мудрой“ фармуліроўкай разьмежаваньня паняцьця „нацыяналізму“ і „дэмакратызму“ выступіў на абарону нацыянал-дэмакратызму, выстаўляючы палітычна-варожы лёзунг аб тым, што супроць нацыянал-дэмакратызму могуць змагацца толькі беларусы, альбо тыя, хто жыве доўгі час на Беларусі і ведае беларускую мову.

Гэта было апошняе выступленьне, якое канчаткова разаблачыла контррэвалюцыйную сутнасьць Ляшэвіча. Ляшэвіч атрымаў моцны адпор з боку ўдзельнікаў зьезду, а каляктыў Бел. КТА рэзка асудзіў і адмежаваўся ад выступленьня Ляшэвіча і пазбавіў яго дэлегацкага мандату.

Агульны сход студэнтаў курсу прызнаў, што нацыянал-дэмакратычная вылазка Ляшэвіча зьяўляецца лёгічным вынікам усёй яго палітычнай і ідэалёгічнай варожасьці. На сходзе выявілася, што Ляшэвіч за ўвесь час яго прабываньня студэнтам Унівэрсытэту ў сваіх выступленьнях на сходах у часе заняткаў і ў прыватных гутарках выявіў сябе як палітычна варожы і ідэалёгічна чужы элемэнт, які сьвядома кампрамэтуе лінію Камуністычнай Партыі і рэвізуе марксыцка-ленінскую ідэалёгію.

Ляшэвіч імкнуўся зьвесьці на Камуністычную Партыю паклёп нібы-та „Палітыка Камінтэрну — ёсьць палітыка вайны, бо вайна, па думцы камуністых, павінна прывесьці да сусьветнай рэвалюцыі“.

Ідэолёг кулацтва моцна адчувае хуткі тэмп індустрыялізацыі краіны і рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Ляшэвіч заяўляе: „раз партыя праводзіць індустрыялізацыю, дык няма чаго супярэчыць супроць разарэньня вёскі“.

У сваіх яўна нацыянал-дэмакратычных выступленьнях Ляшэвіч пад маскай няклясавага пункту гледжаньня імкнуўся аформіць ідэалёгію клясавага ворага, кулака і нэпмана, арыентуючыся на заходні фашызм. Яшчэ ў 1926 годзе выступаючы па
дакладу т. Крыніцкага на
неным партыйным сходзе, Ля
заявіў, што партыя вядзе па
прыдушэньня беларусоў. Атры
належны адпор, пазьней Ля
адмаўляецца ад адкрытай бар
спрабуе атакаваць лінію парты
цыянальным пытаньні рознымі
нымі шляхамі. Ляшэвіч ім
замаскіравацца, даводзячы, шт
цыянал-дэмакратызму па су
няма і барацьба партыі супро
цыянал-дэмакратызму накіро
фактычна супроць шчырых бела
Пераможнае сацыялістычнае
пленьне на капіталістычныя
краіны прымусілі нацыянал-дэ
таў шалёна супраціўляцца.
віч імкнецца перанесьці аго
заяўляе: „Прычынай праяўлен
цыянал-дэмакратызму і розна
шавінізму зьяўляюцца пастано
зьезду КПБ, які перагнуў пал
пытаньня“.

Ляшэвіч агаляе славуту
нацыянал-дэмакратаў—арыента
заходні фашызм. Ён выказвае
неабходнасьць увядзеньня на
русі латынскага альфабэту.

Рэвізія марксыцка-ленінска
алёгіі знайшла свой выраз у імк
сказіць ленінскае вучэньне аб
тарскай рэвалюцыі. Паводле
Ляшэвіча наша пралетарск
валюцыя зьяўляецца менш за
най, чымся буржуазная рэва
1789 году, бо пралетарскай р
цыяй можна назваць толькі так
валюцыю, якая зьнішчыла да
клясы“.

У скажэньні пралетарска
чэньня аб вытворча-эканамічным
цыпе клясавай дыфэрэнцыяцы
мады, падмяняючы прынцып в
часьці прынцыпам патрэб, ка
„больш кваліфікаваных рабочы
на прыраўняць да кулацтва,
кулацтва эксплёатуе, так і кв
каваныя рабочыя эксплёатуюць
рабочых, атрымліваючы больш
шай“.

Цікава адзначыць манэўр Л
віча на сходзе. На сходзе Л
віч каяўся і прасіў дапамагч
выправіць яго памылкі, пры
агаласіў сваю заяву, у якой ён н
адмовіўся ад своіх поглядаў. А
самым сходам у гутарках з та
шамі ён апошнімі словамі лаяў
„Рабочий“, якая дала паліт
ацэнку яго прамовы на зьезьдзе
кароў.

Студэнцкія арганізацыі
што ідэолёгам клясава-варожы
сіл ня можа быць месца ні ў
ні ў Чырвонай Арміі, ні ў саюзе
пастанавіў выключыць Ляшэ
з ліку студэнцтва, узьняць пыт
аб выключэньні з Саюзу друк
аб забароне ўступленьня ў Чыр
Армію, куды Ляшэвіч імк
пралезьці.

Ільлюш

Сумная гісторыя пра адзін сынтэз, аднаго прафэсара і аднаго студэнта

(ФЭЛЬЕТОН).

Ен гэты прафэсар, паволі ўвашоў на сцэну, абапёрся лакцямі на катэдру і тоненькім пяшчотным голасам загаварыў...

„...і я думаю, што гэты, як яго... стыль сучаснай літаратуры павінен быць дыялектычна-матар'ялістычным...“.

Шэпт адабрэньня пракаціўся па залі...

Ружовенькі, нізенькі. тоўсьценкі прафэсар выцер хустачкай лысіну і ўрачыста працягваў:...

„Вось калі возьмеце пэрыяд „Нашай Нівы“, дык гэты будзе тэзіс... і паглядзеў у паперку.

У зале стала ціха...

„А калі Вы возьмеце (а чаму Вам ня ўзяць?) пасьлякастрычнікавую літаратуру, дык гэта будзе... антытэзіс...

І зноў зірнуў у паперку.

„А калі Вы возьмеце пралетарскую літаратуру, дык гэта будзе... будзе сынтэз...

І скамячыў паперку, палажыў яе ў кішэню і вышаў.

У залі хтось-ці хіхікнаў.

Хтось-ці чмыхнуў.

Хтось-ці ваваг... заплакаў...

Дужа жаласна выйшла ў прафэсара...

Тады вышаў адзін студэнт і доўга тлумачыў чарговыя задачы па ліквідацыі няпісьменнасьці...

Было гэта на адным дыспуце, здаецца, літаратурным...

Кажуць, што гэты самы прафэсар чытае ў БДУ лекцыі па беларускай літаратуры з гэтым самым „марксыцкім“ падыходам.

А то яшчэ ведаў я аднаго студэнта таксама „марксыцтага“, дык ён так такі і заявіў:

— Наша пралетарская, кажа, рэвалюцыя, кажа, зусім не пралетарская, бо пралетарскае рэвалюцыя зьнішчае, кажа, усе клясы...

Заявіў і ўсё... як той прафэсар са сваім сынтэзам...

Нават і ў паперку ня зірнуў..

А кваліфікаваныя рабочыя, кажа, зусім і не рабочыя, а кулакі.

Ну, што ты яму зробіш?

Ну, а калі Вы таварыш студэнт (як Вас) вы будзеце кваліфікаваным настаўнікам, дык мусіць будзеце тады зусім буржуй? Га?

А калі неяк сталася, што студэнт гэты ды зрабіў нацыянал-дэмакратычную вылазку і яго ўзгрэлі, дык ён паціснуў плячыма і адказаў:

„Вінаваты тут 12-ы Зьезд КП(б)Б, бо каб ня ён, дык-бы і нацыянал-дэмакратызму ня было, а як пачалі змагацца з ім, з гэтым нацыянал-дэмакратызмам, дык ён на табе... — узяў ды зьявіўся.

Дакажы гэтаму хлопцу, што ён не вярблюд.

І што Вы думаеце?

Не разумеюць гэтыя Прафкомаўцы „марксыцтага“.

— Ты, брат, кажуць, тав. Ляшэвіч гэтае... нацыянал-дэмакрат і ўсё такое.. нават пра цябе ў „Рабочем“ напісалі...

— Ат, кажа, Ляшэвіч, трэба лацінкай газэту друкаваць у Беларусі, тады зусім другое, а то кажыце напісалі...

— Дык мусіць такі і выключылі яго з БДУ, хто яго ведае...

Пакутуе чалавек ад розуму...

Жук.